# Заканчэньне

Прыведзеныя ў манаграфіі *Беларуская эміграцыйная пісьмовасьць* факты, здарэньні, погляды, падзеі й постаці пераканаўча сьведчаць аб тым, што беларускія эмігранты праявілі максымум добрае волі, ахвярнасьці й патрыятызму дзеля ратаваньня на чужым грунце пачуцьця нацыянальнае тоеснасьці, годнасьці й гордасьці ў душах тых суайчыньнікаў, якія ў выніку гістарычных прысудаў апынуліся па-за межамі сваёй Радзімы, а таксама тых беларусаў, што засталіся на роднай зямлі й былі паддадзены жорсткай русыфікацыі.

Пра свайго роду місійнасьць беларускай эміграцыі можам гаварыць і ў тым сэнсе, што яна з выключнай пасьлядоўнасьцю падтрымлівала ў беларускіх сэрцах веру ў тое, што раней ці пазьней разваліцца Савецкі Саюз і на яго руінах вызваленыя народы, у тым і беларускі народ, створаць суверэнныя нацыянальныя дзяржавы.

Да гонару беларускай эміграцыі належыць і тое, што ніколі яна не спаўзла на грунт шавінізму, нянавісьці й пагарды да іншых народаў. Культывуючы ідэю незалежнасьці й суверэннасьці Беларусі, выступаючы супраць русыфікацыі Радзімы, дамагаючыся для роднай мовы рангу адзінай мовы дзяржаўнай, экспануючы нацыянальную сымболіку, зусім адменную, чым сымболіка савецкая, беларускія эмігранты рашуча выступалі таксама супраць сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры й марксістоўска-ленінскай мэтадалёгіі ў навуцы.

Эміграцыя ня толькі ў мінуўшчыне, але і ў сучаснасьці выклікала й выклікае жорсткі супраціў з боку ўрадавых беларускіх колаў, якія пасьлядоўна захоўваюць рэлікты сталіншчыны, што праяўляюцца, між іншым, у красаваньні помнікаў рэвалюцыйных дзеячоў у шматлікіх беларускіх гарадох і сёлах; у такіх назовах вуліц, як вуліца Карла Маркса, Кірава, Сьвярдлова, Калініна, Дзяржынскага, альбо Камсамольская, Савецкая, Рэвалюцыйная, Камуністычная, і перадусім ва ўсеўладным панаваньні расейшчыны на дзяржаўных



межах Беларусі, ва ўсіх міністэрствах, у парлямэнце, ва ўрадзе і ў Адміністрацыі Прэзыдэнта.

Дыскрымінацыя ўсяго беларускага найбольш яскрава праяўляецца ў школьнай сыстэме, дзе беларуская мова зьведзена да рэліктавых, заміраючых разьмераў. Праявай крайняй бязглуздасьці ў гэтай галіне была сілавая ліквідацыя Гуманітарнага Агульнаадукацыйнага Ліцэя імя Якуба Коласа, які мог бы стацца сымбалем беларускага адраджэньня, калі б дзейнічаў у сапраўды суверэннай і незалежнай нацыянальнай дзяржаве.

Беларускія ўрадавыя колы быццам бы не разумеюць таго, што чым болей будзе ў Беларусі абмежаваньняў, санкцыяў і перасьледаў у адносінах да апазыцыйных дзеячоў і непрыхільнасьці ды варожасьці да роднае мовы, пагарды да нацыянальнай сымболікі, тым болей будзе ізаляцыі, непрыхільнасьці й варожасьці з боку дэмакратычных дзяржаваў сьвету да беларускіх урадавых колаў, уключна з прадстаўнікамі найвышэйшых дзяржаўных узроўняў.

Беларуская эміграцыя, не зважаючы на ўсе нявыгады, цяжкасьці й клопаты, зьвязаныя з выгнаньніцкім лёсам, з высока ўзьнятай галавою пранесла свой нацыянальны гонар, сваю родную мову, сваё пачуцьцё годнасьці, а яе творцы ўзбагацілі беларускую публіцыстыку, мастацкую літаратуру й навуку такімі вялікімі каштоўнасьцямі, якія перамогуць усе перашкоды й стануцца арганічнай часткай нацыянальнай беларускай культуры.

Усе мы сёньня стаім на развалінах бальшавіцкай сыстэмы й на руінах сталінскай дзяржаўнасьці. І маем права спытаць, хто – савецкія дзеячы ці эмігранты – першымі пачалі дэмаскаваць такія сталінскія злачынствы, як: жорсткая сілавая калектывізацыя вёскі, масавыя расстрэлы й забойствы гэтак званых ворагаў народу, страшэнная лягерная сыстэма, русыфікацыя многіх падсавецкіх народаў, у тым ліку й беларускага народу, ліквідацыя свабоды чалавечай асобы, безьлітоснае зьнішчэньне шматпартыйнасьці ў грамадзка-палітычным жыцьці, манструальнае раздуваньне культу бальшавіцкіх заправілаў, дзікая расправа з рэлігіяй і духавенствам, нішчэньне сьвятыняў, агрэсія й анэксіі ў адносінах да незалежных краін і народаў? Адказ на так пастаўленае пытаньне ёсьць толькі адзін – з гэтымі пачварнымі злачынствамі, пачынаючы ад першых месяцаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, змагаліся эмігранты, а не савецкія дзеячы.

Ідэя свабоды чалавека, супраціў у адносінах да русыфікацыі, абарона свабоднага мысьленьня пранізвала й пранізвае беларускую эміграцыйную публіцыстыку, навуку, літаратуру й мастацтва, пачынаючы ад самага пачатку, і кожны, хто стараецца гэта замоўчваць альбо затойваць перад народам, зьяўляецца сапраўдным ворагам народу, які пры дапамозе зману й фальсыфікацыі стараецца ізноў загнаць уласны народ у чужую няволю й рабства.

Прагну шчыра падзякаваць усім тым беларускім эмігрантам, якія адчынілі перада мною бібліятэкі й сховішчы з эміграцыйнай публіцыстыкай, мастацкай літаратурай і навукай. Асаблівую ўдзячнасьць кірую ў адрас Дырэктараў Беларускай Бібліятэкі імя Францішка Скарыны ў Лёндане – біскупа Чэслава Сіповіча й айца Аляксандра Надсана, Дырэктара Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью-Ёрку др Вітаўта Кіпеля, Зоры Кіпель, праф. Антона Адамовіча, др Вітаўта Тумаша, др Янкі Запрудніка, Антона Шукелойця, Сяргея Карніловіча, Кастуся Калошы, Нюры й Валодзі Русакоў і многіх іншых беларусаў у Лёндане, Брадфордзе, Нью-Ёрку й Клīўлэндзе. Дзякую таксама карэнным ангельцам і амэрыканцам – Джыму Дынглею, Арнольду МакМілану, Томасу Бэрду. На жаль, многіх з названых беларусаў няма ўжо сярод жывых. Аднак іх гарачая вера ў свой народ і ў магчымасьць паклікання да жыцьця сапраўды незалежнай і суверэннай дзяржавы з дамінуючай пазыцыяй беларускае мовы раней ці пазьней зьдзейсьніцца ва ўсіх сфэрах беларускага нацыянальнага побыту.